**Пракапцова В.П.,** *дацэнт*
**Густава Л.А.,** *суіскальнік*

# РОЛЯ СУПРАСЛЬСКАГА ІРМАЛАГІЁНА 1598-1601 гг. У МУЗЫЧНА-ПЕЎЧАЙ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Вывучэнне і даследаванне невядомых старонак з гісторыі беларускай музычнай культуры - важная задача музыказнаўства. Адна з маладаследаваных праблем - богаслужэбная музыка беларускай праваслаўнай царквы.

Выкарыстоўванне жанраў, структур тэкстаў, напеваў візантыйскага паходжання мясцовымі спевакамі-распеўшчыкамі, засваенне грэчаскіх спеваў і перапрацоўка іх на свой лад. Распяванне пераводных тэкстаў грэчаскімі напевамі - падобнамі, адыход ад арыгінала як шлях для пранікнення ў царкоўныя спевы народнапесенных інтанацый. Фарміраванне на беларускіх землях кіеўска-літоўскага роспеву, які развіваўся разам з яго варыянтамі, што склаліся ў Смаленску, Міры, Полацку, Вільні, Супраслі. Запісы мясцовых напеваў Багданам Анісімовічам - пеўчым Супрасльскага манастыра.

Супрасльскі ірмалагіён 1598-1601 гг. - самы старажытны помнік беларускіх сярэдневяковых унісонных спеваў. Гэты ірмалагіён - рукапісная транскрыпцыя безлінейнай стаўпавой натацыі лінейнай нотай.

Заснаванне Супрасльскага Благавешчанскага манастыра князем Аляксандрам Хадкевічам у 1498 г. У цэнтры ўвагі настаяцеля і царкоўнага старасты - бібліятэка і пеўчае мастацтва.

Складанне зборнікаў песнапенняў выключна манахамі, вольнанаёмнымі пеўчымі (каб на ўсе «патомныя часы» захаваць старажытныя традыцыі пеўчага мастацтва і паралельна зацвердзіць новую галіну царкоўнага роспеву - роспеву Супрасльскага манастыра). Факт напісання Супрасльскага ірмалагіёна лінейнай натацыяй на мяжы XVI-XVII стст., калі манастыр быў яшчэ праваслаўным (з 1603 г. да 1839 г. ён быў уніяцкім), -

сведчанне насцелай неабходнасці ўвядзення ў пеўчую практыку ўсходніх славян лінейнай натацыі.

Аналіз рукапісу дае ўяўленне аб разнастайным рэпертуары манастырскага хору, аб высокамастацкім узроўні музычных густаў і сталым майстэрстве старажытных пеўчых. У Супрасльскім ірмалагіёне сабраны ўвесь цыкл літургічнай музыкі. Характэрная рыса ірмалагіёна - асаблівая ўвага да паходжання розных напеваў (супрасльскага, грэчаскага, мултанскага, царгародскага - як пазначана ў рэмарках рукапісу). Адна з прымет высокай эстэтычнай каштоўнасці музыкі Супрасльскага ірмалагіёна - непасрэдны ўплыў народна-песеннага меласу, што ў працэсе аналізу дазваляе зрабіць вывад аб генезісе станаўлення многіх старажытнапеўчых форм.

Час, калі складаўся ірмалагіён, быў часам арыгінальнай беларускай творчасці. Тэкст ірмалагіёна раздзельнамоўны, напісаны скорапісам. Наяўнасць хамоніі гаворыць аб глыбокай старажытнасці Супрасльскага ірмалагіёна. Яго мелодыі нагадваюць паў-ночна-заходні і кіеўска-літоўскі распевы, часткова адчуваецца балканскі ўплыў.

Складальнік ірмалагіёна Багдан Анісімовіч не толькі перапісчык-перакладчык крукавых знакаў на лінейную натацыю. Аўтар імкнецца захаваць рэдкія і цікавыя напевы свайго краю, і таму яго твор мае вялікую дакументальную каштоўнасць. Багдану ўласцівы і яскравы мастацкі дар: старонкі рукапісу ўпрыгожаны аўтарскімі малюнкамі і арнаментам. Яго манахромныя мініяцюры настолькі прыгожыя і вытанчаныя, што іх можна параўноўваць з лепшымі гравюрамі Ф.Скарыны. Ірмалагіён мае і вялікую філалагічную каштоўнасць. Шмат якія каментарыі ў кнізе напісаны на беларускай мове XVI ст. Як музыказнаўца і мастак, Багдан Анісімовіч лічыцца адным з найбольш прыметных прадстаўнікоў беларускай культуры XVI ст.

Супрасльскі ірмалагіён 1598-1601 гг., напісаны Багданам Анісімовічам, - унікальны збор беларускіх нацыянальных царкоўных напеваў, сведчанне арыгінальных і вялікіх дасягненняў беларускай багаслужэбнай царкоўна-пеўчай культуры ў канцы сярэднявякоўя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ